**Метадычная распрацоўка музычнага занятку для дзяцей 5-6 гадоў “Падарожжа ў тэатр”.**

**Мэта:** фарміраванне ўяўленняў пра тэатр, як від мастацтва, развіццё музычна-творчых здольнасцей дзяцей.

**Задачы:** пазнаёміць з паняццямі “афіша”, “антракт”, “аркестр”, “апладысменты”; фарміраваць уменне адрозніваць характар музычных твораў; развіваць пеўчыя навыкі, пачуццё рытму, каардынацыю рухаў і міміку; выхоўваць культуру паводзін у грамадскіх месцах і цікавасць да тэатральнай дзейнасці.

**Матэрыял і абсталяванне:** музычны цэнтр, фартэпіяна, мультымедыйны праектар, ноўтбук, прэзентацыя, канверт, запрашальны білет, музычныя інструменты (ложкі, бубны, металафоны, маракас, званочак).

**Ход занятку:**

*Дзеці заходзяць у залу пад “Марш” С. Пракоф’ева. Выконваецца музычнае прывітанне: музычны кіраўнік прапявае “Добры дзень, дзеці”, дзеці спяваюць у той жа танальнасці “Добры дзень”. Сюрпрызны момант: педагог паказвае канверт.*

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, сёння раніцай я знайшла вось такі незвычайны канверт, а ў ім - запрашальны білет. Нас клічуць у чароўную краіну, дзе жывуць казка і музыка. Як вы думаеце, што гэта за месца? *(Адказы дзяцей).*

**Музычны кіраўнік:** Гэта тэатр! Якія тэатры вы ведаеце? *(Адказы дзяцей: тэатр лялек, музычны тэатр, тэатр оперы і балета, драматычны тэатр).* Дзеці, сёння мы пойдзем ў тэатр оперы і балета. Спачатку мы пойдзем пешшу *(выконваюцца простыя крокі)*, потым паедзем на трамваі *(тупаценне),* а далей будзем падымацца па лесенцы *(крокі з высокім падыманнем ног).* Гатовы, пайшлі!

**Выконваецца гульнявое практыкаванне “Дарога ў тэатр”.**

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, мы падыйшлі да тэатра оперы і балета ў сталіцы нашай краіны - Мінску. Паглядзіце на экран. *(На экране фотаздымак тэатра).*

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, што нам трэба паглядзець, каб даведацца, які ў тэатры сёння ідзе спектакль? *(На экране фотаздымак афішы).*

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, сёння ў гэтым тэатры будзе выконвацца балет П.І.Чайкоўскага “Шчаўкунок”.

**Музычны кіраўнік:** Паглядзіце, якія розныя касцюмы і маскі сустракаюцца ў гэтым спектаклі! *(На экране фотаздымкі розных касцюмаў і масак).*

**Музычны кіраўнік:** Прапаную зараз вам прапець гук “А”, перадаючы вясёлы і сумны настрой.

**Дзеці спяваюць мажорныя і мінорныя трохгучча на гук “А”.**

**Музычны кіраўнік:** А зараз, дзеці, уважліва паслухаем урывак з балета П.І.Чайкоўскага “Шчаўкунок”, які называецца “Вальс кветак”.

**Дзеці слухаюць “Вальс кветак” з балета “Шчаўкунок”.**

**Музычны кіраўнік:** Якая гэта музыка па характары? *(адказы дзяцей: лёгкая, казачная).* Так, музыка чароўная, вельмі прыгожая. У балеце акцёры не размаўляюць голасам, а ўсё расказваюць з дапамогай руxaў, танца. Паспрабуем зараз з дапамогай мімікі, жэстаў, рухаў перадаць вобразы розных герояў.

**Выконваецца гульня-пантаміма "Мы- артысты".**

*Пад розную музыку дзеці павінны вызначыць героя: хітрая ліса (сярэдні рэгістр, плаўная музыка), нязграбны мядзведзь (нізкі рэгістр, цяжкія крокі), маленькая мышка (высокі рэгістр, стаката).*

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, каб спектакль атрымаўся яскравым, артыстам у тэатры дапамагаюць розныя людзі: касцюмеры, грымёры, музыканты. А калі музыкантаў багата – гэта называецца "аркестр". Зараз мы з вамі возьмем музычныя інструменты і выканаем знаёмы музычны твор.

**Выконваецца шумавы аркестр "Гарэзная полька".**

*Дзеці бяруць металафоны, ложкі, бубны, маракас, званочак і выконваюць любы знаёмы музычны твор разам з педегогам-дырыжорам.*

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, у тэатры перапынак у спектаклі называецца "Антракт", а гледачы дзякуюць артыстам гучнымі "Апладысментамі". Прапаную вам гучна паапладзіраваць адзін аднаму за цікавае падарожжа, якое сёння ў нас адбылося. (*Дзеці апладзіруюць).*

**Музычны кіраўнік:** Дзеці, у якім тэатры мы з вамі сёння былі? Што вам спадабалася ў гэтым тэатры больш за ўсё? *(адказы дзяцей).* Наша падарожжа на гэтым скончылася. Трэба развітваццa.

*Дзеці развітваюцца па музычнаму (прапяваюць за музычным кіраўнікам "Да пабачэння") і пад спакойную музыку выходзяць з залы.*